


# МІХАЙЛАЎСКІ ЛІСТОК

КРАСАВІК, 2016

Свята-Міхайлаўскі прыход г. Мінска, вул. Янкоўскага, 2


# АКАФІСТ У ГОНАР БОЖАЙ МАЦІ

На працягу стагоддзяў было створана шмат цудоўных малітваў і песень у гонар Божай Маці. Адной з найбольш вядомых сярод праваслаўных хрысціянаў з’яўляецца «Акафіст у гонар Божай Маці». Аўтарства яго звычайна прыпісваецца патрыярху Канстантынопальскаму Сергію, які жыў у першай палове VI ст. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што Акафіст больш ранняга паходжання. Як бы там не было, ён хутка пашырыўся па ўсёй тагачаснай Візантыі. З прыняццем хрысціянскай веры славянамі Акафіст быў перакладзены на царкоўнаславянскую мову. Францыск Скарына змясціў яго ў сваёй Малой Падарожнай Кніжцы, якая выйшла ў Вільні ў 1522 г.

Назва «акафіст» паходзіць ад грэцкага словазлучэння Ἀκάθιστος ὕμνος, што можна перакласці як «несядальны гімн» – гімн, які трэба спяваць стоячы. Ён складаецца з 24 песень (строф). У грэцкім тэксце гэтыя песні, якія называюцца ікасамі (οἶκος), пачынаюцца кожная чарговай літарай грэцкага алфавіту. Прысвячэнне адрозніваецца характарам ад іншых песень і не звязанае з імі акравершам. Яно напэўна было напісана пазней і не з’яўляецца складовай часткай першапачатковага Акафіста. Парныя песні (другая, чацвёртая і г.д.; у славянскім тэксце яны

завуцца кандакамі ад грэцкага κοντάκιον) канчаюцца воклічам «алілуія». Няпарныя (у славянскім тэксце ікасы) маюць кожная па 13 пахвал Багародзіцы, якія пачынаюцца словам «радуйся». Адсюль і іншая назва акафіст – «Радасці Багародзіцы». Апошняя пахвала паўтараецца цягам усяго акафіста. На грэцкай мове яна гучыць: Χάιρε νύμφη ἀνύμφετε, а ў перакладзе на славянскую: «*Радуйся невесто неневестна*». Па сутнасці гэта даслоўны пераклад.

Хоць Акафіст з’яўляецца гімнам у гонар Багародзіцы, змест яго глыбока хрысталагічны. У ім апяваецца Божае мацярынства, месца Багародзіцы ў Божым плане збаўлення роду людскога. Увесь твор можна падзяліць прыблізна на дзве часткі. У першай частцы расказваецца аб прыйсці у свет Бога-Слова, ад Дабравешчання да сустрэчы, калі праведны Сімеон у прынесеным у святыню Дзіцяці прызнаў Збавіцеля. Другая частка – гэта лірычны роздум над глыбокімі тайнамі, аб'яўленымі ў евангельскіх расказах.

Месца Акафіста Багародзіцы ў храмавай літургічнай практыцы даволі сціплае. Служба Акафіста здзяйсняецца ў пятую суботу Вялікага Посту. Калісьці у гэты дзень здзяйснялася свята Дабравешчання, якое потым было замацавана як нерухомае. Субота ж ад таго часу пачала называцца Суботай Акафіста.

Тым не менш, Акафіст вельмі пашыраны ў келейным ужытку. Многія вычытваюць Акафіст досыць часта. У некаторых храмах прынята чытаць яго за дадатковым богаслужэннем – пад час малебна. Чытанне Акафіста звычайна сканчаецца кароткай малітвай ў гонар Багародзіцы.

**З блаславення настаяцеля Свята-Міхайлаўскага прыхода протаіерэя Ігара Галакава**
***Падрыхтаваў Алесь Спіцын***
**Дата выпуску: 16 красавіка 2016 г.**